# НавінЫ

БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 16 (49)

7 чэрвеня 2001 г.


## КРДС вызначала прыярытэты

*Апошняе паседжаньне Каардынацыйнай Рады дэмакратычных сілаў праходзіла ў "малым фармаце", без прадстаўнікоў рэгіёнаў, і мела на мэце абмеркаваньне тэхнічных пытаньняў.*

На паседжаньні былі абмеркаваныя й падрыхтаваныя да прыняцьця зьмены ў рэглямэнт, якія прадугледжваюць пашырэньне колькасьці суб'ектаў КРДС коштам рэальна існуючых агульнанацыянальных кааліцыяў.

"У цэнтры нашай увагі былі прыярытэты дзейнасьці КРДС. Бальшыня суб'ектаў настойвае на тым, каб не адмаўляцца ад галоўнай задачы: вылучэньня адзінага кандыдата для выбарчай кампаніі", – сказаў Вінцук Вячорка (лідэр Партыі БНФ, арганізацыі, якая старшынявала на паседжаньні).

На паседжаньні былі папярэдне прынятыя дзьве заявы. Першая прысьвечаная нядаўняй правакацыі з выбухам у расейскай амбасадзе. "Мы лічым, што гэта справа рук рэжыму. Гэты інцыдэнт шмат у чым нагадвае ведамы лёзьненскі мэрсэдэсаўскі самастрэл. Тады, як і зараз, Лукашэнка знаходзіўся ў стане перадвыбарчай кампаніі і відавочна, што гэтая правакацыя як нельга лепш сёньня патрэбная рэжыму", – гаворыцца ў заяве.

Другая заява – ацэнка выказваньняў Селязьнёва і іншых расейскіх лідэраў аб магчымым "канстытуцыйным замацаваньні" саюзнай дзяржавы Беларусі й Расеі. Было падкрэслена, што зь беларускага боку ўсе саюзныя пагадненьні апошняга часу былі падпісаныя ці ратыфікаваныя нелегітымнымі альбо міжнародна не прызнанымі органамі.

Усе прынцыповыя пытаньні было вырашана вынесьці на пленарнае паседжаньне, якое адбудзецца пры ўдзеле рэгіянальных дэмакратычных кааліцыяў, магчыма, ужо пасьля абвешчаньня выбараў.

Андрэй УРБАНОВІЧ



## Партыі каардынуюць сваю дзейнасьць

*4 чэрвеня ў Менску адбылася першая прэсавая канфэрэнцыя Міжпартыйнага цэнтру па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў, удзел у якой бралі Вячаслаў Сіўчык (Партыя БНФ), Леанід Лемяшонак (Беларуская партыя працы), Натальля Хрусталёва (Беларуская партыя жанчынаў "Надзея"), Валеры Пракаповіч (Беларуская экалягічная партыя зялёных (БЭЗ)), Алег Багуцкі (БСДГ), Аляксандар Цынкевіч (АГП).*

Удзельнікамі прэсавай канфэрэнцыі было заяўлена, што ўпершыню ў беларускай гісторыі большасьць партыяў (10 з 18 цяпер існуючых) аб'ядналі свае намаганьні дзеля рэалізацыі права нашага народу на дэмакратычныя, сумленныя, празрыстыя выбары прэзыдэнта. Адзіны мэханізм гэтага, на іхную думку, – уваход прадстаўнікоў палітычных партыяў ў склады выбарчых камісіяў усіх роўняў. Паводле словаў Вячаслава Сіўчыка, "Міжпартыйны цэнтар гатовы вылучыць кандыдатуры ўва усе тэрытарыяльныя камісіі", а іх усяго 160, пры гэтым будзе забясьпечаная наяўнасьць 50% сябраў выбарчых камісіяў усіх роўняў. Сп. Сіўчык таксама зазначыў, што "калі будуць прынятыя 10-20% кандыдатураў, гэта засьведчыць, што рэжым рыхтуецца да фальсыфікацыяў. Але мы спадзяемся, што нашы прадстаўнікі будуць у камісіях".

Усе ўдзельнікі прэсавай канфэрэнцыі выказалі гатоўнасьць сур'ёзна працаваць. Прадстаўнік Беларускай экалягічнай партыі зялёных (БЭЗ) Валеры Пракаповіч адзначыў: "Гэта адзіны шанец беларусаў пачаць нармалёвае жыцьцё. Мы ўпэўненыя ў перамозе".

Сярод журналістаў была распаўсюджаная заява "Аб каардынацыі дзейнасьці палітычных партыяў па вылучэньні кандыдатаў у камісіі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь",

Працяг на стар 2.

vytoki.net

Пачатак на стар. 1

# Партыі каардынуюць сваю дзейнасьць

што былая прынятая на паседжаньні Міжпартыйнага цэнтру 15 траўня 2001 г., у якой падпісанты (а гэта акрамя тых шасьці партыяў, прадстаўнікі якіх ладзілі прэсавую канфэрэнцыю, яшчэ Беларуская партыя зялёныя, БСДП (НГ), ЛДП і Сацыял-дэмакратычная партыя Народнай Згоды) разьлічваюць на падтрымку грамадзянаў Беларусі, грамадзкіх арганізацыяў, прафсаюзаў і міжнароднай супольнасьці.

## Заява

***Аб каардынацыі дзейнасьці палітычных партыяў па вылучэньні кандыдатаў у камісіі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.***

Мы, прадстаўнікі палітычных партыяў, зацікаўленыя ў тым, каб было рэалізаванае права беларускага народу на дэмакратычныя выбары Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

Адной з найважнейшых структураў для правядзеньня прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. зьяўляецца сыстэма выбарчых камісіяў. На жаль, выбары ў Палату прадстаўнікоў не адпавядалі міжнародным стандартам, якія прад'яўляюцца да дэмакратычных выбараў, не былі выкананыя мінімальныя абавязкі па правядзеньні свабодных, справядлівых, роўных і адкрытых выбараў. Адной з галоўных прычынаў неадпаведнасьці гэтых выбараў мінімальным міжнародным патрабаваньням стала ажыцьцяўленьне выканаўчай уладай кантролю за работай выбарчых камісіяў.

Хаця Выбарчы кодэкс і прадугледжвае магчымасьці вылучэньня прадстаўнікоў палітычных партыяў у выбарчыя камісіі, на самой справе ўсе сябры выбарчых камісіяў прызначаліся з прадстаўнікоў органаў выканаўчай улады і дзяржаўных установаў, якія знаходзяцца ў іхным падпарадкаваньні. Такі прынцып фармаваньня прывёў да перадузятага стаўленьня сябраў выбарчых камісіяў да кандыдатаў. Выбарчыя камісіі фактычна працавалі ў інтарэсах існуючай улады.

Для таго каб гарантаваць рэалізацыю канстытуцыйнага права грамадзянаў Беларусі на дэмакратычныя выбары Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, мы, прадстаўнікі 10 палітычных партыяў,

Аб'яднаная грамадзянская партыя,
Беларуская партыя жанчынаў "Надзея",
Беларуская партыя зялёныя,
Беларуская партыя працы,
Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада,
Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада),
Беларуская экалягічная партыя зялёных (БЭЗ),
Лібэральна-дэмакратычная партыя,
Партыя БНФ,
Сацыял-дэмакратычная партыя Народнай Згоды,

патрабуем ад выканаўчай улады пры фармаваньні Цэнтральнай камісіі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, абласных, гарадзкіх, раённых, раённых у гарадах і ўчастковых камісіяў забясьпечыць прадстаўніцтва ў іх палітычных партыяў. Мы гатовыя забясьпечыць вылучэньне 50% сябраў выбарчых камісіяў усіх роўняў.

Для арганізацыі практычнай работы па вылучэньні кандыдатаў у сябры камісіяў мы ўтвараем Міжпартыйны цэнтар па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў.

У гэтым мы разьлічваем на падтрымку грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, грамадзкіх арганізацыяў, прафсаюзаў і міжнароднай супольнасьці.

**15.05.2001 г.**

# Падзея тыдня

*Сама наяўнасьць расейскай амбасады ў Менску ёсьць відавочнай супярэчнасьцю зь ідэалягічнымі пастулятамі, якімі кіруюцца мясцовыя ўрадоўцы. Дыпляматычнае прадстаўніцтва Расеі для сёньняшняй Беларусі – значна большы фактар уплыву на масавую сьвядомасьць, чым любое іншае: амэрыканскае, польскае, нямецкае. Гэта неабвержнае сьведчаньне прынамсі фармальнай асобнасьці нашае краіны ў вачах ейных грамадзянаў, ва ўмовах адзінай інфармацыйнай і маскультурнай прасторы. Таму выбух на тэрыторыі амбасады мае свой, на першы погляд малазначны, розгалас і сэнс.*



Рэч у тым, што цяпер мы маем рэальны прэцэдэнт на тое, што дагэтуль уяўлялася ледзьве не сьвятым. На абшары, які Расея лічыць цалкам сваім, а тутэйшыя эліты вагаюцца з вызначэньнем магістральнага кірунку разьвіцьця, адбываецца акт палітычнага тэрарызму (ці ягоная імітацыя, што ў дадзеным выпадку абсалютна неістотна). Гэта насамрэч адбылося, таму што стала набыткам грамадзкасьці менавіта ў такой якасьці. Думкі, ідэі, вобразы, якія навязваюцца абывацелю, сыходзяцца ў адным – камусьці ў Беларусі выгодна сапсаваць стасункі з усходнім суседам, і гэты нехта дастаткова магутны й упэўнены ў сваіх сілах, каб зрабіць справу такім чынам. Выяўляецца, што ў цэнтры сталіцы РБ, пры гарантаванай уладай стабільнасьці, м[...] гранату на тэрыторыю РФ і застацца абсалютна беспакараным. Значыць, Расея перастала быць "сьвяшчэннай каровай", якая стаіць над усім і перадусім, перастае быць эталёнам прыцягальнасьці для кожнага беларуса.Гэта спакваля прыходзіць да галавы, калі аналізуеш зьмест прапаганды, якая выкарыстоўвае інфармацыйную нагоду. Зьдзіўляе іншае. Тое, што напад ці правакацыя былі зьдзейсьненыя менавіта супраць амбасады, а, скажам, ня супраць якога-небудзь эканамічнага аб'екту. Ясна адно – расейская прысутнасьць становіцца толькі адным з фактараў перадвыбарчай кампаніі, разам з польскім, амэрыканскім і інш.

Зь іншага боку, гэты выбух можа паслужыць каталізатарам палітычнага экстрэмізму ў моладзевых асяродках, зноў жа праз сваю беспакаранасьць і ўяўную лёгкасьць выкананьня. Пры агульным нарастаньні хвалі тэрарызму й ягонай рамантызацыі ў сьвеце гэтага нельга ня ўлічваць.

І, нарэшце, стала відавочным, што эксплюатацыя "інтэграцыйнай" тэмы існуе для цяперашняга рэжыму толькі ў якасьці сродку ўтрыманьня ўлады. У Маскве гэта добра зразумелі, што выклікала пошукі альтэрнатывы, якія яшчэ працягваюцца, ці робіцца выгляд, што працягваюцца.

*P.S. Праз паўсутак пасьля "выбуху гранаты" адбылося ўрачыстае закладаньне падмурку новай расейскай амбасады на вуліцы Нававіленскай. Будаўніцтва павінна скончыцца ў 2003 годзе, за 2 гады да плянаванага ўводу агульнай валюты.*

**Андрусь УНУЧАК**

vytoki.net

# Малады Фронт сустрэў саміт СНД сюрпрызамі

*31 траўня Малады Фронт урачыста адзначыў правядзеньне саміту краінаў СНД.*




З самага ранку на скрыжаваньні вуліцаў Багдановіча і Варвашэні, паміж дзьвюма дваццаціпавярховымі дамамі лунаў велізарны (2,5 на 5 м) сьцяг Эўразьвязу, які добра было відаць з прэзыдэнцкай рэзыдэнцыі, гатэляў "Плянэта","Беларусь" і розных кропак Менску. Акцыя мела назву "БЕЛАРУСЬ – У ЭЎРОПУ!" і зьяўлялася выклікам лукашэнкаўскаму СНД-эшнаму сходу.

У гэты ж дзень, у 15:20, маладафронтавец Іван Тамашэвіч зь бела-чырвонабелым сьцягам праехаў на роліках каля штаб-кватэры СНД і рэзыдэнцыі Лукашэнкі. За гэтым відовішчам назіралі шматлікія мінакі, міліцыянты й супрацоўнікі КДБ. Затрымаць хлопца здолелі толькі ў раёне мэтро "Кастрычніцкая". Даставіўшы у Ленінскі ГАМ, канфіскавалі сьцяг і, пратрымаўшы паўтары гадзіны, адпусьцілі, ня склаўшы пратаколу.

## Моладзь прыбірае краіну ад сьмецьця

*5 чэрвеня ў Дзень аховы навакольнага асяродзьдзя Малады Фронт правёў акцыю "Ачысьцім горад ад сьмецьця!".*

Акцыя адбылася ў Менску і некатрых іншых гарадах. Асноўнай ідэяй акцыі было прыбіраньне вуліцаў і плошчаў зь беларускімі назвамі. Калі вуліца мае савецкую назву – няхай і жыве ў саўковым брудзе.

У Менску прадстаўнікі раённых радаў Маладога Фронту прыбіралі тэрыторыю Лошыцкага парку і пляц Якуба Коласа. Дзейнасьць маладафронтаўцаў вельмі спадабалася мясцовым камунальным службам, якія шчыра дзякавалі маладафронтаўцам за добрасумленную працу і запрашалі да далейшага супрацоўніцтва.Другая буйнамаштабная акцыя адбылася ў Бабруйску, дзе прадстаўнікі мясцовай філіі Маладога Фронту пазьбавілі ад сьмецьця Цэнтральны парк.

Акцыя "Ачысьцім горад ад сьмецьця" праходзіла ў межах маладафронтаўскай кампаніі "ГОРАД – НАШ !"

**Матэрыялы рубрыкі падрыхтавала прэс-служба Маладога Фронту**

# Мабілізацыйны сэмінар у Чашніках

*2-3 чэрвеня ў мястэчку Чашнікі Грамадзкае Аб'яднаньне "Цэнтар Моладзевых Ініцыятываў "Контур" правёў сэмінар, прысьвечаны арганізацыі мабілізацыйнай кампаніі.*

Акрамя прадстаўнікоў НА удзел у сэмінары прынялі мясцовыя прадпрымальнікі. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі ролю выбараў у працэсе функцыянаваньня дзяржаўных інстытутаў, выбарчае заканадаўства і арганізацыю масавых мерапрыемстваў, азнаёміліся з найноўшай гісторыяй непалітычных кампаніяў Сэрбіі, Харватыі, Славачыны і Украіны.

Пэрсанальна для прадпрымальнікаў была прачытаная лекцыя пра пэрспэктывы развіцьця сярэдняга й малога бізнэсу ў Беларусі.

Па заканчэньні сустрэчы абылася арганізаваная дыскусія, у выніку якой былі вызначаныя асноўныя мерапрыемствы, што мусяць прайсьці ў Чашніках у межах мабілізацыйнае кампаніі.

**Інфармацыйная служба ГА ЦМІ "Контур"**

# Дзень абароны навакольнага асяродзьдзя ў Бабруйску

*Экалягічная тэма – самая балючая тэма ня толькі ў Беларусі, але й ува ўсім сьвеце.*

Каб зьвярнуць увагу грамадзкасьці на існуючыя праблемы навакольнага асяродзьдзя, 5 чэрвеня бабруйскія арганізацыі Маладога Фронту й Маладых Сацыял-Дэмакратаў праводзілі акцыі па прыборцы тэрыторыі гарадзкога парку й помніка прыроды гораду Лукаўскае гары. А 15.00 маладзёны часткова прыбралі гарадзкі парк, пазьбіраўшы паперчын[...] [...] тэлькі, выкарыстаныя гумавыя вырабы ды іншае сьмецьце. А 18.00 моладзь сабралася на Лукаўскай гары, куды вельмі падабаецца выходзіць на пікнікі й амаль культурны адпачынак мноству бабруйчанаў. Там таксама была праведзеная "зачыстка" тэрыторыі: сьмецьце было спакаванае ў адмысловыя пакункі ды занесенае на сьметнікі найбліжэйшага мікрараёну.

**Алёна АНДРЭЕВА**



# Затрыманьні ў Горках

*1 чэрвеня ў Горках былі затрыманыя пяцёра ўдзельнікаў акцыі "Падзяліся ўсьмешкай".*

Мерапрыемства было прымеркаванае да Дня абароны дзяцей і праводзілася Горацкай арганізацыяй Маладога Фронту ў межах мабілізацыйнае кампаніі ў Аршанска-Горацкім рэгіёне. У дзіцячым парку Горак (а менавіта там праходзіла гэтае мерапрыемства) сабралося каля 50-ці дзяцей. Ім дарылі паветраныя шарыкі, беларускія кніжкі. Акрамя таго, ладзіліся конкурсы дзіцячых малюнкаў на асфальце, гульні й віктарыны. Гучала музыка гурту NRM. Дзецям раздавалася газэта "Несьцерка", а іхным бацькам – спэцвыпуск газэты "Народная воля" пра зьніклых палітыкаў і ўлёткі з заклікамі прыняць удзел у маючых адбыцца прэзыдэнцкіх выбарах.

Акцыя доўжылася гадзіну. Яна была спыненая асабіста начальнікам горацкага РАУС, які затрымаў пяцёх удзельнікаў. Пры гэтым ён адмовіўся назваць прычыну затрыманьня. Дзеці не маглі зразумець, куды й за што забіраюць арганізатараў гульні, якая ім вельмі спадабалася.

**Інфармацыя прадастаўленая ЦПГІ "Крывіч" (г. Ворша)**

vytoki.net

# Вячаслаў СІЎЧЫК: "Мы імкнемся, каб было рэалізаванае права народу на дэмакратычныя выбары"

*15 траўня 10 партыяў прыйшлі да пагадненьня па пытаньні вылучэньня кандыдатаў у камісіі па выбарах Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь. Каардынатарам Міжпартыйнага цэнтру па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў зьяўляецца намесьнік старшыні Партыі БНФ Вячаслаў Сіўчык. Сёньня ён адказвае на пытаньні рэдакцыі "Навінаў БНФ".*



– Як Партыя БНФ будзе ўдзельнічаць у працы выбарчых камісіяў?

– У зьвязку з тым, што БНФ мусіць прыняць актыўны ўдзел у прэзыдэнцкай кампаніі, вельмі важным аспэктам зьяўляецца тое, што за апошнія пяць гадоў лукашэнкаўскі рэжым паставіў пад жорсткі кантроль сыстэму выбарчых камісіяў. Гэтыя выбарчыя камісіі ўжо сфальсыфікавалі вынікі чатырох кампаніяў: рэфэрэндумы 1995 і 1996 гадоў, выбары ў мясцовыя саветы й выбары ў «палату прадстаўнікоў». Прычым з кожнай выбарчай кампаніяй маштабы фальсыфікацыі ўзрасталі, пры гэтым усё больш і больш людзей дэмакратычных поглядаў проста выводзіліся з складу гэтых камісіяў. Той фарс, які мы назіралі ў 2000 годзе пры выбарах у «палату прадстаўнікоў», калі людзі, паводле вэрсіі спадарыні Ярмошыны, якая давала інтэрвію пасьля галасаваньня, яшчэ мусілі прыйсьці на выбарчыя ўчасткі Менску й іншых буйных гарадоў нашае краіны, немагчыма назваць выбарамі.

БНФ заўсёды імкнуўся, каб было рэалізаванае права беларускага народу на дэмакратычныя выбары, таму мы мусім добра разумець, што без дэманапалізацыі сыстэмы лукашэнкаўскіх выбарчых камісіяў ні пра якія прэзыдэнцкія выбары гаварыць не выпадае. Таму 15 траўня гэтага году паводле нашай ініцыятывы быў створаны Міжпартыйны цэнтар па вылучэньні прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі, бо такую працу, як вылучэньне людзей і прапіхваньне іх у камісіі, немагчыма зрабіць на базе толькі адной партыі.

Каардынатарам гэтага цэнтру зьяўляюся я. Мы мусім стварыць рэальную кааліцыю й прапрацаваць схему, каб правесьці нармальных людзей ў сыстэму выбарчых камісіяў. Першыя крокі зробленыя: 10 палітычных партыяў пагадзіліся з тым, што надзвычай важна вылучыць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі ўсіх роўняў і што патэнцыял гэтых партыяў дазваляе вылучыць да паловы сяброў выбарчых камісіяў.

Сёньня ў Міністэрстве юстыцыі нашае краіны зарэгістравана 18 палітычных партыяў. Гэта азначае, што большасьць па[illegible] прыйшлі да згоды па гэтым пытаньні. Рэжыму будзе вельмі цяжка адкідаць прадстаўнікоў палітычных партыяў, якія скансалідавана вырашылі даваць сваіх прадстаўнікоў у камісіі. Напрыклад, калі будзе зарэгістравана толькі 10% тых людзей, якіх дасьць наш Міжпартыйны цэнтар, гэта будзе як лякмусавая папера. Тады будзе цалкам зразумела: рэжым загадзя рыхтуецца да масавых фальсыфікацыяў.

Калі б рэжым не баяўся выбараў, то ўлады былі б найбольш зацікаўленыя дапусьціць нашых прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі. Мы маем права быць прадстаўленымі ў выбарчых камісіях, і я спадзяюся, што мы здольныя будзем рэалізаваць гэтае права.

– Дзякуючы чаму ўдалося дасягнуць згоды паміж партыямі?

– Усё праходзіла цяжка, ва ўсякім разе, за часы лукашэнкаўскай дыктатуры не ўдавалася, каб партыі так масава выказаліся салідарна. У Міжпартыйны цэнтар уваходзяць розныя партыі: тыя, што ёсьць у КРДС; апазыцыйныя партыі, якія не ўваходзяць у КРДС; партыі, якія наагул выступалі ў свой час з лукашэнкаўскага боку. Працэс быў вельмі складаны і вельмі добра, што ўсё-такі згода дасягнутая.

– Хутчэй за ўсё Лукашэнка ня будзе прытрымлівацца закону. Як супрацьстаяць беззаконьню тым людзям, якія будуць працаваць у камісіях?

– Нашая задача, каб на прэзыдэнцкіх выбарах выконваўся закон. Калі ён будзе вытрымлівацца, ніякіх масавых фальсыфікацыяў, натуральна, ня будзе, бо ў законе яны не прапісаныя. Іншая справа, што ёсьць практыка гэтых масавых фальсыфікацыяў у Беларусі. І супрацьстаяць можна толькі адным: спробай дэманапалізаваць выбарчыя камісіі, чым мы рэальна займаемся.

Тут хапае нюансаў, таму што сам закон мае вельмі шмат падводных камянёў. Адзін зь іх – гэта тое, што хаця палітычныя партыі маюць права на вылучэньне сваіх прадстаўнікоў, саму сыстэму выбарчых камісіяў фармуюць выканаўчыя структуры зь верху да нізу. Чаму былі ўзятыя палітычныя партыі? Каб можна было ўсяму сьвету ясна паказаць, як ставіцца да дэмакратычных выбараў сёньняшні рэжым. Акрамя таго, моманты, зьвязаныя з вылучэньнем людзей у выбарчыя камісіі, досыць складаныя ў тэхналягічным пляне. Вылучаць сваіх прадстаўнікоў у тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі трэба на наступны дзень пасьля абвяшчэньня даты выбараў. Я прагназую, што пасьля абвяшчэньне даты выбараў адразу пачнецца прэзыдэнцкая кампанія і надзвычай важна, каб нашыя людзі ўсталёвалі кантакт з выканаўчымі структурамі, аддзеламі раённых адміністрацыяў, каб ужо цяпер нашыя людзі ведалі, куды трэба несьці пратаколы, узоры якіх распрацаваныя юрыдычнай камісіяй. На вылучэньне ў тэрытарыяльныя камісіі будзе мінімум часу, і тут нельга прамарудзіць ні дня.

– Наколькі вялікая рэальнасьць допушчэньня ў камісіі?

– Вельмі высокая. Так склалася, што гэта будзе патрабавана з усіх бакоў. Справа ў тым, што Масква па любым сцэнары будзе спрабаваць легітымізаваць Аляксандра Лукашэнку, і ясна, што калі ён на першым жа этапе не дапусьціць да рэгістрацыі кандыдатаў у прэзыдэнты, не дапусьціць палітычныя партыі ў выбарчыя камісіі, легітымізаваць рэжым будзе надзвычай цяжка. Нягледзячы на тое, што вельмі часта эўрапейскія краіны ставяцца да Беларусі паводле падвоеных стандартаў, немагчыма, каб нехта мог абгрунтаваць, чаму толькі зьвязаныя з выканаўчай уладай людзі мусяць сядзець у выбарчых камісіях.

Я думаю, што ціск будзе і з захаду, і з усходу, але самае галоўнае, што й сам беларускі народ жадае, як сьведчаць вынікі сацыялягічных апытаньняў, каб выбарчыя камісіі складаліся з прадстаўнікоў розных палітычных сілаў. Таму я прагназую, што ў Беларусі дастаткова шмат людзей, у тым ліку й тых, што пры ўладзе, якія будуць рэалізоўваць гэтыя прынцып. Ва ўсякім разе, калі будзе брутальны адказ, невядома, каму ад гэтага будзе горш, таму што ў любым выпадку ў сыстэме камісіяў будуць нашыя людзі. Ня ўсіх мы будзем вылучаць ад палітычных партыяў, гэта зразумела, але падкрэсьлю, што сама рэгістрацыя нашых кандыдатаў у сябры камісіі, будзе якраз лякмусавай паперай наконт намераў рэжыму пры правядзеньні прэзыдэнцкіх выбараў. Прычым лічбы абвергнуць будзе вельмі цяжка.

**Гутарыла Настасься ГЕРАСІМОВІЧ**

vytoki.net

# Грамадзкія стасункі й стасункі з грамадзкасьцю

## Рэпэтыцыя інтэрвію

PR-спэцыяліст дамовіўся з рэдакцыяй пра публікацыю інтэрвію, ягоны "ліст-прынада" спрацаваў і цяпер трэба рыхтавацца да гутаркі з журналістам прадстаўніка партыі (арганізацыі). Гэтым прадстаўніком можа быць сам галава партыі, ягоны намесьнік ці адмыслова падрыхтаваны для інтэрвію сьпікер (аратар, выканаўца тэксту PR-звароту ў дыялёгавай форме). Асабліва неабходна рэпэтаваць тэлевізійныя інтэрвію.

PR-спэцыяліст сам ладзіць гэтыя рэпэтыцыі. Менавіта ён лепш ведае, якія моманты ТБ-інтэрвію патрабуюць дадатковага акцэнтаваньня, менавіта ён лепш за іншых можа ацаніць і імідж партыі, які стварае сьпікер, агульны эфэкт ТБ-перадачы.

Папярэдняе сумоўе зь сьпікерам зводзіцца да ўразуменьня агульнай сытуацыі, удакладненьня функцыянальных задачаў прадстаўніка партыі (арганізацыі).

Правяраецца веданьне сьпікерам асноўных ідэяў і тэксту PR-звароту.

Выпрацоўваецца манера, стыль паводзінаў перад тэлевізійнай камэрай. Вызначаецца танальнасьць гутаркі з журналістам-газэтчыкам.

Сцэнары будучага інтэрвію, напісаныя у форме пытаньне-адказ, чытаюцца ўголас з разьмеркаваньнем роляў на розныя галасы (сьпікер адказвае на ўмоўныя пытаньні).

Відэакліп, зроблены падчас чытаньня сцэнару, павінны паказаць чарнавы варыянт будучага ТБ-інтэрвію, выявіць хібы сплянаванай на гэтым этапе гутаркі з журналістам.

Нечаканыя пытаньні адмыслова рэпэтуюцца перад "сапраўдным" інтэрвію.

Папярэдняе знаёмства сьпікера з журналістам пажаданае, асабліва перад тэлевізійным інтэрвію, але не абавязковае (а для дасьведчанага спікера й зусім залішняе).

Аналіз усёй гэтай папярэдняй працы завяршае падрыхтоўку да сустрэчы з журналістам. Аналіз улучае ацэнку тэлегенічнасьці, пераканаўчасьці, той ступені даверу, які выклікае сьпікер.

Радыёінтэрвію рэпэтуецца з выкарыстаньнем аўдыёкасэты.

## Сьпікер: неабходныя якасьці

Першаступенная задача сьпікера – "дагрукацца" да ўвагі мэтавай аўдыторыі. Папярэдняя важнасьць гэтай абставіны падпарадкоўвае сабе ўсе выразныя сродкі інтэрвію. Інтэрвію ёсьць першым важным сродкам наладжваньня стасункаў з мэтавай аўдыторыяй. Другі важны срод[illegible]бходных якасьцяў самога сьпікера, што спрыяе даверу публікі (ягоным словам, ягонаму іміджу).

PR-спэцыяліст, ацэньваючы сьпікера паводле 5-бальнай сыстэмы, павінны адказаць на шэраг пытаньняў.

Ключ да тэсту

120 балаў – сума найвышэйшых адзнакаў прафэсійных якасьцяў сьпікера. Зыходзячы з гэтага крытэру, вызначаюцца тры роўні ягонай падрыхтаванасьці.

Высокі ровень – 100-120 балаў (рэпэтыцыя не патрэбная, толькі інструктаж);

Сярэдні ровень – 80-90 балаў (неабходныя інструктаж і рэпэтыцыя);

Стартавы ровень, які патрабуе шматразовых рэпэтыцыяў, дэталёвага інструктажу – 60-79 балаў.

Любыя іншыя сумы балаў – ад 59 і менш – характарызуюць няпоўны набор неабходных якасьцяў (наяўнасьць адных і адсутнасьць іншых характарыстык), што не забясьпечвае посьпеху задуманага інтэрвію.

Максымальны бал ацэнкі адной якасьці – 5 балаў.

| Галіна | Якасьць |
|---|---|
| Культура зносінаў | умее слухаць суразмоўцу |
| | можа падтрымліваць гутарку на любую тэму |
| | знаходзіць пярэчаньні й контраргумэнты |
| | адчувае характар суразмоўцы |
| | зразумела выкладае свае думкі |
| | цэніць трапнае слова, крылатыя выразы |
| | здольны прызнаваць памылковасьць сваіх перакананьняў |
| Спэцыялізацыя | дыплямаваны PR-спэцыяліст (спэцыяліст рэкламы) з досьведам практычнай працы |
| | практычны работнік рэклямнага бізнэсу со стажам да 5 гадоў |
| | спэцыяліст творчых прафэсіяў (актор, літаратар, журналіст) |
| Тэхніка маўленьня | выразная артыкуляцыя |
| | уменьне трымаць паўзу |
| | правільны (нарматыўны) націск у словах |
| | правільнасьць акцэнтоўкі фразы |
| | акустычнасьць голасу (тэмбар, гучнасьць, звонкасьць) |
| | эмацыйнасьць маўленьня |
| Памяць | запамінае тэкст (1 старонка) (цалкам, напалову, асноўныя ідэі) |
| | запамінае парады й інструкцыі падчас падрыхтоўкі да інтэрвію (цалкам, часткова) |
| | ведае досьвед (прыёмы, знаходкі, сакрэты) іншых сьпікераў |
| Плястыка | матываваная жэстыкуляцыя |
| | выразнасьць мімікі |
| | пастава падчас хады, за сталом, у фатэлі, стоячы |
| Усьмешка | уменьне размаўляць усьміхаючыся (штучная ўсьмешка, натуральная і інш.) |
| Гарнітур | уменьне апранацца з густам (модна, экстравагантна й г.д.) |

Падрыхтаваў Сяргей КАНДРАТОВІЧ

vytoki.net

# Адукацыя

*(скарочаны варыянт для "Навінаў БНФ")*

Іван САВЕРЧАНКА

***Стрыжань сацыяльнай пэрспэктывы беларускай грамадзянскай супольнасьці – адукацыя, няспыннае набыцьцё новых ведаў. На жаль, у нацыянальнай сыстэме адукацыі апошнім часам узьніклі сур'ёзныя збоі, за якія грамадзтву давядзецца плаціць высокі кошт. Якія прынцыповыя элементы належыць разьвіваць, каб сыстэма адукацыі эфэктыўна выконвала свае базавыя функцыі?***



*Іван САВЕРЧАНКА*

## Мэты і задачы

Нацыянальныя сыстэмы адукацыі на пачатку XXI стагодзьдзя – разгалінаваная сыстэма з многімі кампанэнтамі, шматроўневыя ўзаемадзеяньні і карэляцыі між якімі вызначаюць аблічча сучаснага грамадзтва.

Галоўная мэта адукацыйнай сыстэмы палягае ў падрыхтоўцы грамадзяніна, усебакова далучанага да сацыяльнага досьведу, нацыянальных, цывілізацыйных і маральных каштоўнасьцяў.

У сучасных умовах адукацыйная сыстэма, якая няспынна абнаўляецца і ўдасканальваецца, аб'ектыўна мусіць вырашаць комплекс грамадзкіх задачаў, структурна злучаных у чатыры блёкі.



*Студэнты хімічнага факультэту БДУ*

1. Цывілізацыйная дастатковасьць, якая прадугледжвае:

– фармаваньне біясфэрнага мысьленьня і шырокай экалягічнай абазнанасьці сучаснага чалавека;

– прывядзеньне ў адпаведнасьць псыхалягічнага, фізыялягічнага й тэхналягічнага ўзростаў цывілізацыі, дысбалянс між якімі дасягнуў катастрафічнай фазы;

– усьведамленьне роўнай каштоўнасьці культураў асобных народаў, этнасаў, рэгіянальных і кантынэнтальных лучнасьцяў, гуманістычнай вартасьці сусьветных рэлігіяў і вучэньняў, натуральнасьці існаваньня шматмоўнага і мультыкультурнага сьвету;

– гарманічнае спалучэньне тэхнічных, прыродазнаўчых і гуманітарных ведаў, дапушчальная адпаведнасьць іх аб'ёму і прапорцыяў, гарантыі бясьпечнага існаваньня чалавецтва як біялягічнага віду.

2. Бясьпека нацыі і дзяржавы. Уключае падрыхтоўку высокапрафэсійных кадраў, якія забясьпечваюць эканамічны росквіт, тэхналягічны прагрэс, стабільнае функцыянаваньне дзяржаўных інстытутаў і аптымальнае супрацоўніцтва зь іншымі краінамі сьвету ў сацыяльна-эканамічнай, вайскова-палітычнай ды грамадзка-культурнай сфэрах.

3. Грамадзянская супольнасьць. Мае на ўвазе выпрацоўку ідэалёгіі мірных узаемадачыненьняў у краіне, якая ўключае:

– супрацоўніцтва дзяржаўных і грамадзкіх структураў, арганізацыяў, асобаў, урадавых і няўрадавых установаў;

– партнэрства прафэсійных канглямэратаў;

– "дамоўленасьць" паміж сацыяльнымі станамі;

– міжнацыянальны, міжканфэсійны і міжкультурны дыялёг.

4. Духоўна-культурны прагрэс грамадзтва і дасканаласьць асобы. Гэты блёк задачаў прадугледжвае засваеньне традыцыяў свайго народу, маралі й этыкі, выкарыстаньне лепшых здабыткаў іншых народаў, што ўтрымліваюць такія гуманістычныя каштоўнасьці, як сумленнасьць, патрыятызм, чалавечая й нацыянальная годнасьць. Абавязковым зьяўляецца дасягненьне гармоніі паміж духоўным і фізычным пачаткамі, маральлю й інтэлектам.

Галоўны арыенцір пераўтварэньняў у галіне адукацыі на сучасным этапе палягае якраз у выхадзе іх з правінцыйна-прыдаткавага становішча, набыцьці выразных рысаў нацыянальна-дзяржаўнай самадастатковасьці, пры гэтым абавязкова вонкава адкрытых, ніякім чынам не ізаляваных ад дабратворных уплываў і ўзаемадзеяньняў, і што вельмі істотна – празрыстых для грамадзкага аналізу.

У аснову адукацыйнай палітыкі Рэспублікі Беларусь стратэгічна апраўдана пакласьці найбольш эфэктыўную й дальнабачную дактрыну асваеньня, трансфармаваньня і адаптаваньня найноўшых тэхналягічных, навукова-фундамэнтальных, прыродазнаўчых і гуманітарных ведаў, створаных сучаснымі заходнімі й усходнімі цывілізацыямі, не абмяжоўваючыся палітыка-ідэалягічнымі ўстаноўкамі бягучага моманту.

*Працяг на стар 7.*

vytoki.net

Пачатак на стар 6.

# Адукацыя

## Структура і роўні

Найгалоўнейшая ўнівэрсальная праблема – выпрацоўка аптымальнай структуры сыстэмы нацыянальнай адукацыі, шчыльна дастасаванай да сусьветных адукацыйных стандартаў. Шматвяковая пэдагагічная традыцыя і прагназаваныя пэрспэктывы разьвіцьця даюць цьвёрдыя падставы арыентавацца на чатырохроўневую мадэль з дадатковым пятым кампанэнтам:

I ровень – дзіцячы сад, дашкольнае выхаванне й навучанне (з 3 да 6 гадоў);

II ровень – пачатковая й агульная сярэдняя школа (з 6 да 16 гадоў);

III ровень – прафэсійна-тэхнічныя вучэльні, ліцэі, ліцэйскія клясы, сярэднеспэцыяльныя ўстановы (тэхнікумы і каледжы) (з 16 да 20 гадоў);

IV ровень – вышэйшыя навучальныя установы (унівэрсытэты, інстытуты, акадэміі) (з 20 да 24 гадоў).

Нарэшце, дадатковы кампанэнт – інстытуты павышэньня кваліфікацыі, перападрыхтоўкі кадраў (без узроставых абмежаваньняў).



Падчас заняткаў у адной зь сярэдніх школаў гораду Барысава

Першы ровень. Надзёная праблема першага адукацыйнага роўню – захаваньне дзеючай інфраструктуры – блізу 4500 дашкольных установаў, праз якія магчымае забесьпячэньне прыкладна 500 тыс. дзетак. Надзвычай важны перавод выхаваўчага працэсу на нацыянальныя праграмы, якія пасьпяхова прайшлі апрабацыю ("Пралеска" ды інш.).

Другі ровень. У агульнаадукацыйнай школе, пры фармаваньні галоўнага еднага дакумэнту – "Навучальнага пляну", зыходзіць зь неабходнасьці, пацьверджанай эўрапейскай пэдагагічнай думкай, уключэньня сямі абавязковых цыклаў (групаў) прадметаў, якія ў залежнасьці ад складанасьці маюць ад аднаго да трох роўняў:

- філялягічны
- гісторыка-грамадазнаўчы
- матэматычны
- прыродазнаўчы
- тэхналягічная і працоўная падрыхтоўка
- спартовы
- эстэтычны.

Сродкам і надзейным бар'ерам на шляху суб'ектыўных, адвольных маніпуляцыяў з разьмеркаваньнем сеткі гадзінаў па клясах у тыдзень школаў рознага тыпу можа стаць "Нацыянальны плян". У адпаведнасьці зь ім будуюцца і навучальныя праграмы па ўсіх прадметах (яны няспынна ўдакладняюцца камісіямі спэцыялістаў).

Пры ажыцьцяўленьні школьніцкай адукацыйнай палітыкі найважнейшы арганізацыйна-творчы прыярытэт – пераадолець разнапланавыя супярэчнасьці паміж гарадзкімі й сельскімі школамі, улічваючы непазьбежныя ва ўмовах Беларусі дыспрапорцыі паміж колькасьцю школаў і навучэнцаў. Да ліку галоўных задачаў належыць аднесьці распрацоўку і ажыцьцяўленьне адмысловай нацыянальнай праграмы "Сельская школа", якая б дазволіла трансфармаваць усе еймыя кампанэнты, давесьці асноўныя парамэтры да вызначанага стандарту.

Перавод школы на 12-гадовае навучаньне абавязкова спалучыць з прынцыпам закону аб прафэсійным войску, бо інакш здольныя юнакі пазбавяцца шанцу паступіць у ВНУ і прадоўжыць бесьперапыннае навучаньне.

Другі адукацыйны ровень акурат найбольш аптымальны для рэалізацыі асноўных выхаваўчых кампанэнтаў, найперш праз маладзёвыя грамадзкія арганізацыі (скаўтынг ды інш.) зь іхнымі гуманнымі мэтамі й прынцыпамі, сярод якіх – шанаваньне законаў, грамадзянская адказнасьць і ўдзел у разьвіцьці грамадзтва, патрыятызм, вернасьць сваёй радзіме, выхаваньне нацыянальна сьвядомай асобы праз гісторыю, народную культуру, мастацтвы, фальклёр, павага да чалавечай годнасьці, міжнароднае сяброўства, адказнасьць за свае ўчынкі і паводзіны.

Трэці ровень. Сярэдне-спэцыяльныя навучальныя установы – тэхнікумы й каледжы мусяць ажыцьцяўляць падрыхтоўку кадраў вузкай спэцыялізацыі.

Аптымальная колькасьць спэцыялістаў сярэдне-спэцыяльнай адукацыі – да 25000 у год.

Рэестр (Клясыфікатар) спэцыяльнасьцяў у тэхнікумах, каледжах, вучэльнях давесьці да 140.

Чацьверты ровень. Адна з галоўных задачаў у сфэры адукацыі – пертварыць вышэйшыя навучальныя ўстановы ў сапраўдныя культурна-творчыя й гуманістычна-асьветніцкія асяродкі. Раней вызначаная функцыя ВНУ выключна як "кузьні кадраў", жорстка падпарадкаванай патрэбам народнай гаспадаркі, відавочна, мусіць быць перагледжаная, абноўленая, хаця, натуральна, ні ў якім выпадку яна ня можа быць зьменшаная ці тым больш адкінутая.

Базавым прынцыпам канцэпцыі падрыхтоўкі новых спэцыялістаў у вышэйшых навучальных установах варта прызнаць арыентацыю на ўнівэрсалізм, дастатковую шырыню ведаў, фундамэнтальнасьць. У сучасных умовах у ВНУ найбольш мэтазгодна рыхтаваць кадры шырокага прафэсійнага дыяпазону,

Працяг на стар 8.

vytoki.net

Пачатак на стар. 6

# Адукацыя

скіраваныя на шматсэктарную прафэсійную дзейнасьць – спэцыяліст, кіраўнік, каардынатар, дасьледчык, выкладчык профільнай навучальнай установы, а таксама улічваць магчымую перакваліфікацыю ў межах вытворчай сфэры.

Для чацьвертага адукацыйнага роўню цэнтральная праблема – суадносіны політэхнічнай, прыродазнаўчай і гуманітарнай плыняў. У межах краіны, з улікам рэальных патрэбаў вызначаных на падставе статыстычна-сацыялягічных паказьнікаў, прыкладны баланс між імі прапануецца ўстанавіць адпаведна ў наступных прапорцыях: 70%, 20% і 10%.

Ролю дзяржаўнага рэгулятару, пасапраўднаму дзейснага інструмэнту мусіць адыгрываць Дзяржаўны Стандарт, які вызначае асноўныя контуры нацыянальнай навукова-адукацыйнай і культурна-інфармацыйнай прасторы. Падрыхтоўка гэтага дакумэнту агульнанацыянальнага значэньня, зацьверджаньне яго ўрадам і найхутчэйшае ўвасабленьне ў жыцьцё – надзвычай актуальная задача. Дзяржаўны Стандарт прызначаны ажыцьцяўляць агульнае рэгуляваньне, пакідаючы прастору для творчасьці, укараненьня інавацыйных ідэяў, а таксама даючы ВНУ права самастойна будаваць навучальны й навукова-досьледныя працэсы ў адпаведнасьці з абранай спэцыфікай установы. Дзяржаўны Стандарт устанаўлівае Клясыфікатар напрамкаў і спэцыяльнасьцяў, вызначае кола абавязковых дысцыплінаў, якія належыць засвоіць студэнту. Лягічна вылучаць у ім чатыры складовыя (групы) абавязковых дысцыплінаў:

- спэцыяльныя дысцыпліны;
- агульнапрафэсійныя дысцыпліны (для напрамку або спэцыяльнасьці);
- агульныя гуманітарныя й сацыяльна-эканамічныя дысцыпліны;
- матэматычныя й агульныя прыродазнаўчыя дысцыпліны.

Дзяржаўны Стандарт – падмурак уваходжаньня вышэйшай школы Беларусі ў сусьветную адукацыйную прастору. Ён адзіны сродак іадначасна праверааны прававы мэханізм прызнаньня у іншых краінах сьвету нацыянальных дакумэнтаў (пасьведчаньняў) аб вышэйшай адукацыі, без чаго ў прынцыпе немагчымае ўсталяваньне шырокага супрацоўніцтва, трывалых пэдагагічна-навуковых сувязяў, абменаў, творчых кантактаў.

Эканамічна-статыстычны аналіз паводле розных парамэтраў ступені прафэсіяналізацыі вытворчага й сацыяльна-культурнага сэктараў указвае на неабходнасьць удасканаленьня якасных паказьнікаў і колькаснага павелічэньня выпуску спэцыялістаў вышэйшай адукацыі – да 55000 чалавек у год.

Улік выразна акрэсьленых тэндэнцыяў у вытворчай і сацыяльнай сфэрах сьведчыць пра пільную неабходнасьць зьменаў Рэестру (Клясыфікатару) спэцыяльнасьцяў у напрамку яго пашырэньня у вышэйшых навучальных установах – да 250.

Тэрміновага выпраўленьня патрабуе сытуацыя са станам забесьпячэньня навучальных установаў высокапрафэсійным прафэсарска-выкладчыцкім пэрсаналам, што ўваходзіць у асноўны штатны расклад: амаль палова ўсяго выкладчыцкага пэрсаналу ня мае навуковых ступеняў наагул.

З канцэпцыі тварэньня вядучых навучальных установаў бясспрэчна належыць выкінуць дыскрымінацыйныя палажэньні, праўнае й фінансавае ігнараваньне рэгіянальных вышэйшых навучальных установаў. Праз мэханізмы падтрымкі й развіцьця ім якраз варта надаць, на ўзор эўрапейскай традыцыі, больш вагі.

Пяты ровень. З мэтай пашырэньня сеткі пасляўнівэрсытэцкага навучаньня неабходна ўсебакова ўмацаваць адпаведныя нацыянальныя цэнтры, забясьпечыць на практыцы іх высокі статус.

*(далей будзе)*

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас:
220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8, Управа Сойму Партыі БНФ

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

_______________________
(прозьвішча)

_______________________
(імя)

_______________________
(імя па бацьку)

**які нарадзіўся "___" ______________ 19__ г**

**жыве па адрасе:** ______________
(індэкс і поўны адрас)

_______________________

_______________________

**род заняткаў:** ______________

**тэл.** ______________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ "Адраджэньне" падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

________ (дата)　　　　________ (подпіс)

НавінЫ
Б Н Ф "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 16 (49), 7 чэрвеня 2001 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах нутра-н...

Адрас для ліставаньня: 220005, Менск, а/с 42 , тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
рэдактар нумару Аляксей Шэін

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net